Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 26 (648) Пятніца, 16 верасня 1966 года. Год выдання XIX. Цана 2 кап.

Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР даручана распрацаваць праекты палажэнняў аб вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, у якіх прадугледзець далейшую дэмакратызацыю работы навучальных устаноў, расшырэнне правоў іх кіраўнікоў, прадастаўленне большай самастойнасці ў вырашэнні пытанняў навучальнай, навуковай і гаспадарчай дзейнасці, а таксама развіццё ініцыятывы і павышэнне актыўнасці грамадскіх арганізацый студэнтаў і навучэнцаў у рабоце па паляпшэнню навучальнага працэсу, ідэйна-палітычнаму выхаванню і культурна-бытавому абслугоўванню студэнтаў і навучэнцаў.

(З Пастановы Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у краіне»).

МЫ ПРАЦУЕМ ДЛЯ НАРОДА І ПРАЦАВАЦЬ ПАВІННЫ ІНТЭНСІЎНА

ДНЯМІ АДБЫЎСЯ АГУЛЬНЫ СХОД ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА КАЛЕКТЫВУ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА. З ДАКЛАДАМ «ВЫНІКІ 1965—1966 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА І ЗАДАЧЫ НА 1966—1967 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД» ВЫСТУПІЎ РЭКТАР АКАДЭМІК А. Н. СЕЎЧАНКА. У СПРЭЧКАХ ПА ДАКЛАДУ ВЫСТУПІЛІ ДЭКАН БІЯФАКА П. Р. ПЯТРОВІЧ, СТАРШЫНЯ МЯСЦКОМА І. Т. РАГОЎСКІ І ІНШЫЯ.

СЁННЯ МЫ ДРУКУЕМ СКАРОЧАНЫ ДАКЛАД А. Н. СЕЎЧАНКІ

Наступіўшы новы навучальны год будзе першым годам ажыццяўлення важнейшых задач па далейшаму развіццю вышэйшай адукацыі, удасканальванню падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для ўсіх галін народнай гаспадаркі, навукі, культуры, якія вылучыў XXIII з'езд КПСС. Зусім нядаўна ў друку была ўжо апублікавана Пастанова Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у краіне». У ім падкрэсліваецца, што «важнейшай задачай у галіне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляецца далейшае паляпшэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з улікам патрабаванняў сучаснай вытворчасці, навукі, тэхнікі і культуры і перспектыў іх развіцця. Выпускнікі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў павінны быць выхаваны ў духу высокай камуністычнай свядомасці, валодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй, мець навыкі арганізацыі масава-палітычнай і выхаваўчай работы».

Гэтая пастанова пачала ўжо ажыццяўляцца ў нашым універсітэце. Практыка даказала перавагу дзённага навучання. І зараз у нас падвоіўся лік прынятых на гэтую форму падрыхтоўкі маладых спецыялістаў у параўнанні з мінулым годам. Кантрольнымі лічбамі пяцігадовага плана універсітэта прадугледжаецца прытрымлівацца гэтага прыёму і ў наступныя гады: па 2.000 тысячы студэнтаў штогод.

Значна ўзрасце і выпуск маладых спецыялістаў. Калі ў 1966 годзе падрыхтавана 607 чалавек, то ў 1970 годзе іх будзе—1.980, іншымі словамі, выпуск маладых спецыялістаў з адрывам ад вытворчасці ўзрасце больш, чым у тры разы.

Каб лепш і паўней задавальняць патрэбу краіны ў кваліфікаваных кадрах, у нашым універсітэце на працягу пяцігодкі будзе ўведзена навучанне па шэрагу новых спецыяльнасцей: палітэканоміі, філасофіі, геалогіі і разведкі карысных выкапняў, механіцы, рацыянальнай біяфізіцы, цеплафізіцы, радыёхіміі паўправаднікоў, хіміі асноўнага арганічнага і нафтахімічнага сінтэзаў, тэхналогіі тэхнічных валокнаў, гідрабіялогіі і іхтыялогіі і іншых.

Як вядома, у падрыхтоўцы маладых спецыялістаў вялікая роля належыць прафесарска-выкладчыцкаму калектыву. З гэтага пункту гледжання нам трэба ўдзяліць самую сур'ёзную ўвагу пытанню, хто будзе вучыць нашых студэнтаў.

У мінулым вучэбным годзе ў нас працавала 675 навукова-педагагічных работнікаў, з іх 312 дактароў і кандыдатаў навук.

Затым рэктар спыняецца на пытанні павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных работнікаў. На некаторых кафедрах, напрыклад, няма кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У першую чаргу гэта адносіцца да кафедры замежных моў, дзе сярод 63 выкладчыкаў няма ніводнага кандыдата навук. Мала падрыхтавана кандыдатаў навук кафедрай эксперыментальнай фізікі і фізічнай электронікі. На кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі з 12 чалавек вучоныя ступені і званні маюць толькі тры выкладчыкі. А на кафедры электронных матэматычных машын з 19 чалавек — толькі адзін. Нездавальняючае становішча падрыхтоўкі дактароў навук на хімічным факультэце. Такія дактары навук, як т.т. Паўлючэнка, Ярмоленка, Ярафееў, не падрыхтавалі на гэтым факультэце ніводнага доктара. Такія ж справы ў падрыхтоўцы дактароў навук і на біялагічным факультэце; 10 год ужо мінула, як тут ніхто не абараніў доктарскую дысертацыю. 12 дактароў, як было, засталося, хоць фактычна іх стала менш: хто перайшоў працаваць у іншыя ўстановы, а хто выйшаў са строю па стану здароўя. Вучоныя біяфака адарваліся ад надзённых праблем гаспадарчага жыцця рэспублікі, яны збіваюцца на сістэматызацыю тых ці іншых з'яў у прыродзе ў той час, калі біялогія стала адной з важных асноў сучаснай сельскай гаспадаркі і медыцыны. А такая важная праблема, як ураджайнасць, таксама не знаходзіць тут свайго вырашэння. Сама сабой зразумелая задача развіцця тэорыі, але яе нельга адрываць ад практыкі, і спецыялістаў - біёлагаў трэба рыхтаваць для здзяйснення непасрэдных практычных задач народнай гаспадаркі.

Павысіць тэмпы падрыхтоўкі дактароў навук, не імпартаваць іх, а рыхтаваць сваімі сіламі— вось наша задача.

Задача падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў можа быць паспяхова вырашана толькі тады, калі ў гэтай справе стануць прымаць непасрэдны ўдзел найбольш вопытныя вучоныя, а маладыя спецыялісты будуць пастаянна знаходзіцца ў атмасферы навуковай творчасці. Для гэтага неабходна ўключыць у планы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў наступныя мерапрыемствы: работа па індывідуальнаму плану; павышэнне вытворчай кваліфікацыі шляхам прыкамандыравання выкладчыкаў да прамысловых прадпрыемстваў і навукова-даследчых устаноў; семінары па сучасных дасягненнях навукі і тэхнікі, а таксама па спецыяльных пытаннях педагагічнай тэорыі і практыкі; падбор і накіраванне на курсы, інстытуты павышэння кваліфікацыі.

Побач з павышэннем кваліфікацыі выкладчыкаў нам прадстаіць яшчэ раз глыбока прааналізаваць усю сістэму навучання ва універсітэце, змест і метады падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, цвёрда выясніць, наколькі рацыянальна выкарыстоўваецца вучэбны час студэнтаў і іх выкладчыкаў. Дакладна ўстанавіць, ці правільна размяркоўваюцца вучэбныя гадзіны.

У мінулым навучальным годзе працягвалася работа па развіццю самастойнасці студэнтаў у вучобе і прыцягненю іх да ўдзелу ў навуковых даследаваннях.

Трэба адзначыць, што вучэбныя планы факультэтамі выкананы ў сярэднім па універсітэту на 99,97 працэнтаў. Недавыкананне вучэбнага плана на 0,03 працэнта выклікана тым, што студэнты I—IV курсаў некаторы час знаходзіліся на сельскагаспадарчых работах. Вынікі вясенняй экзаменацыйнай сесіі такія: з 4.249 чалавек паспяхова здалі сесію 3.721 (дзённага навучання) ці на 88 працэнтаў, у тым ліку на «выдатна» і «добра»—2.107, на «здавальняюча» 38 працэнтаў, нездавальняюча—518 чалавек ці 12 працэнтаў. Прычым большая частка нездавальняючых адзнак падае на I—III курсы.

Двухгадовы вопыт работы па новых вучэбных планах паказвае, што ў цэлым яны адпавядаюць запатрабаванням падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў. Аднак і гэтыя планы маюць некаторыя недахопы, якія можна прадухіліць, не змяняючы тэрміна навучання. У сувязі са скарачэннем нядзельнай нагрузкі абавязковымі заняткамі на I—IV курсах да трыццаці і на V—да дваццаці чатырох гадзін, агульны вучэбны час скарацiўся па розных спецыяльнасцях на 500—900 гадзін, а па агульна-тэарэтычных і прафіліруючых — на 15—20 працэнтаў.

Такое памяншэнне вучэбнага часу пры недастатковым абсталяванні лабараторый і кафедраў прыводзіць да зніжэння паспяховасці і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. За апошнія два гады мы шмат гаварылі аб перагрузцы студэнтаў і мала аб тым, што вучоба—гэта праца цяжкая, а быць студэнтам—вялікі гонар. Часта «пудзіла» перагрузкі перашкаджае выкладчыкам павышаць патрабавальнасць да студэнтаў.

(Працяг на 2-ой стар.)

Перапынак. У аўдыторыі, збіўшыся ў цесны гурт, студэнты вырашаюць нейкае важнае пытанне... Здагадваюся — размяркоўваюць стыпендыю... Неўзабаве натоўп разышоўся. Застаецца яна, Оля Барысевіч—будучы геолаг, студэнтка першага курса геолага-геаграфічнага факультэта.

Рэпартаж аб вучобе, жыцці, побыту геолагаў чытайце на 2-ой і 3-яй старонках.

У ГРУПЕ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

Адбылося чарговае пасяджэнне групы народнага кантролю нашага універсітэта. Старшыня групы дацэнт А. А. Галаўко падвёў вынікі работы, падрабязна спыніўся на задачах, якія стаяць у новым навучальным годзе перад народнымі кантралёрамі. На пасяджэнні быў зацверджаны план работы групы.

У бліжэйшыя дні народныя кантралёры будуць разглядаць такія пытанні, як выкарыстанне камандзіровачных сродкаў супрацоўнікамі універсітэта, аб праведзеным рамонце ў студэнцкіх інтэрнатах, зберажэнні і выкарыстанні кніжнага фонду бібліятэкай універсітэта.

МЫ ПРАЦУЕМ ДЛЯ НАРОДА

І ПРАЦАВАЦЬ ПАВІННЫ ІНТЭНСІЎНА

(Заканчэнне).

На паспяховасць студэнтаў яшчэ ўплывае і такі фактар, як няпоўнае наведванне лекцый і практычных заняткаў. Ёсць выпадкі, калі асобныя выкладчыкі сваімі лекцыямі і заняткамі не выклікаюць цікавасці ў студэнтаў па той або іншай дысцыпліне. На некаторых факультэтах яшчэ не выкаранена практыка, калі вядучыя прафесары і дацэнты чытаюць невялікія лекцыйныя курсы, перакладваючы асноўную лекцыйную педагагічную нагрузку на маладых, не зусім яшчэ вопытных выкладчыкаў. Вось як, напрыклад, выглядае лекцыйная нагрузка ў прафесараў і дацэнтаў біялагічнага факультэта: М. М. Драко — 86 гадзін, Ю. С. Патапенка — 72, В. С. Карэлін — 82, Н. С. Суднік — 134, О. І. Калешка — 104 і г. д.

Праблема павышэння якасці выпускаемых універсітэтатам спецыялістаў нас вельмі хвалюе. Вучоба — гэта праца, настойлівая, крапатлівая праца, якая фарміруе асобу. Аднак не ўсе яшчэ гэта разумеюць, і студэнт, як гавораць, толькі ў час сесіі робіць «фінішны рывок». А такая вучоба нагадвае спартыўны паядынак. Спорт жа, прычым сапраўдны, трэба ведаць, — гэта таксама сістэматычная праца. Вось і выходзіць, што на экзамене часам правяраецца не творчая работа, а вынослівасць студэнта. Шкода ад гэтага відавочная, бо выхаваны ў такой «працы» чалавек нясе затым прывычку да штурмаўшчыны і на вытворчасці.

Неабходна павысіць патрабавальнасць да кожнага студэнта і адначасова давер'е да яго творчых магчывасцей.

Узровень падрыхтоўкі спецыялістаў у значнай ступені вызначаецца і тым, як была арганізавана іх вытворчая практыка. І тут ёсць недахопы. З аднаго боку, не ўсе кіраўнікі прадпрыемстваў, куды накіроўваюцца студэнты, удзяляюць ім дастаткова ўвагі, а з другога боку, факультэцкія кіраўнікі практыкі не заўсёды добрасумленна адносяцца да выканання ўскладзеных на іх абавязкаў.

У сувязі з гэтым трэба ўстанавіць такі парадак, каб студэнты праходзілі практыку на перадавых і тэхнічна абсталяваных прадпрыемствах, дзе яны змогуць атрымаць неабходныя навыкі і ўменне і ўключыцца ў жыццё рабочых калектываў.

У новым навучальным годзе галоўнай задачай навукова-педагагічных работнікаў будзе ажыццяўленне XXIII з'езда КПСС, накіраваных на выкананне грандыёзных задач новай пяцігодкі, на дастойную сустрэчу новымі працоўнымі поспехамі 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і 100-годдзя нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Працэс навучання студэнтаў неаддзельны ад працэсу іх выхавання перш за ўсё таму, што іменна навучанне і ёсць галоўны фактар выхавання будучага спецыяліста. Ад таго, наколькі адказна выкладчыкі будуць падыходзіць да сваёй педагагічнай работы, наколькі часта яны будуць памятаць аб тым, што яны не толькі паведамляюць студэнту навуковыя палажэнні, факты, прывіваюць практычныя веды, але і дапамагаюць фарміраваць яго светапогляд, залежыць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. У гэтым жа выключная роля належыць кафедрам грамадскіх навук, партыйным і камсамольскім арганізацыям.

Для выхавання ідэйнай перакананасці кожнага студэнта неабходна, каб ён правяраў і замацоўваў свае веды практычна — у лекцыйнай і прапагандысцкай рабоце ва універсітэце, сярод насельніцтва, у кружках і спецсемінарах.

Мы абавязаны паслядоўна ажыццяўляць патрабаванне: «Глыбокае і творчае вывучэнне марксізма-ленінізма — доўг і першы абавязак студэнта!» На пасяджэннях кафедраў грамадскіх навук прадстаіць прааналізаваць арганізацыю самастойнай работы студэнтаў, пастаноўку выхаваўчых мерапрыемстваў. У апошнія гады студэнты павышаюць цікавасць да праблем грамадскіх навук.

Важнае значэнне мае ўдзел кожнага студэнта ў даследчай рабоце, якая з'яўляецца добрай школай навуковага і ідэйнага фарміравання, дапамагае не толькі палепшыць тэарэтычнае навучанне, але і больш — зрабіць паўсядзённую працу асэнсаванай.

Ідэйна-выхаваўчай работай, як вядома, у нас займаюцца грамадскія арганізацыі, кафедры грамадскіх навук і выкладчыкі. Аднак не заўсёды паміж імі ў гэтай справе ёсць узаемасувязь. А адсюль дубліраванне зместу і метадаў, распыленне сіл і сродкаў. Гэта зніжае дзейнасць выхаваўчай работы.

На кожным факультэце неабходна стварыць стройную, навукова-прадуманую сістэму выхаваўчага ўздзеяння на студэнтаў. Нам здаецца, што сістэма ідэйна-выхаваўчай работы з I па V курсы павінна адпавядаць наступным запатрабаванням: ахопліванне ўсіх важнейшых напрамкаў дзейнасці — вучэбнай і навуковай, грамадскай і культурна-масавай, працоўнага выхавання; прымяненне масавых і індывідуальных метадаў работы па прынцыпу — факультэт — курс — група; імкненне да таго, каб на кожным наступным курсе студэнт атрымліваў нешта новае, больш паглыбленае — падобна таму, як гэта робіцца ў навучальным працэсе.

Мы яшчэ сустракаемся з асобнымі фактамі грамадскай пасіўнасці, ідэйнай няўстойлівасці, забыцця сваіх абавязкаў перад народам. Іншы раз наш калектыў не дае гэтым фактам заслужанай ацэнкі. А іменна ў правільных адносінах да гэтых фактаў мужнее ідэйная загартоўка калектыву.

Асобнае месца ў фарміраванні ў студэнтаў ідэйнай перакананасці і патрыятызму займае выхаванне іх на рэвалюцыйных, працоўных і баявых традыцыях савецкага народа і нашай партыі.

Важнай таксама з'яўляецца і фізкультурная работа. У нас жа ў гэтым ёсць два асноўных недахопы: бюракратызыцыя фізкультуры — увядзенне яе строга ў рамкі вучэбных гадзін і слабае развіццё ініцыятыўнасці. Многія нашы выкладчыкі больш-менш добрасумленна адносяцца да фізкультуры, аднак арганізацыйная іх роля малая. Дае сябе адчуваць і слабасць матэрыяльна-тэхнічнай базы фізічнай культуры, а між тым можна было б многае зрабіць шляхам самадзейнай ініцыятывы.

Неабходна сказаць некалькі слоў і аб выкладанні замежных моў ва універсітэце. Вядома, што галоўнай задачай кафедраў замежных моў з'яўляецца забяспечанне паўнацэннага курса навучання, змест якога адпавядаў бы ўзроўню развіцця сучаснай навукі, тэхнікі і культуры, а таксама запатрабаванням грамадства ў высокакваліфікаваных спецыялістах, якія б валодалі замежнымі мовамі. Студэнт павінен атрымаць такі комплекс ведаў, які б даў магчымасць свабодна чытаць, а таксама гаварыць на замежнай мове.

Вось такія задачы ставіць рэктарат і вучоны савет перад кафедрамі замежных моў.

Наша і зарубежная практыка ў апошні год паказвае, якое вялікае значэнне атрымлівае шырокае выкарыстанне розных тэхнічных сродкаў навучання. Аднак тэхнічныя сродкі на кафедрах і факультэтах выкарыстоўваюцца яшчэ недастаткова. У мінулым навучальным годзе слаба выкарыстоўвалася вучэбнае кіно. Неабходна шукаць найбольш эфектыўныя шляхі ўкараненя тэхнічных сродкаў навучання ў вучэбны працэс. Гэта задача ўсіх кафедраў і факультэтаў. Прымяненне метадаў праграмнага навучання і розных іншых тэхнічных сродкаў стварае рэальныя магчывасці палепшыць падрыхтоўку спецыялістаў.

Загадчыкам кафедраў, дэканам факультэтаў неабходна ў гэтым годзе звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на разумнае камплектаванне лабараторый і кафедраў абсталяваннем, прыборамі, на кааперыраванне розных кафедр і стварэнне міжфакультэцкіх лабараторый. А бывае часам і такое, калі ва універсітэце набываюцца такія прыборы, якія ў далейшым ніколі не выкарыстоўваюцца.

Вялікая работа па забеспячэнню навучальнага працэсу належыць адміністратыўна-гаспадарчай частцы, якая прызвана стварыць усе неабходныя ўмовы для вучобы і работы ў навучальных карпусах і для адпачынку ў інтэрнатах. Неабходна пастаянна патрабаваць чысціні і зберажэння маёмасці. Пара арганізаваць нармальную дзейнасць буфетаў і прадажы з латкоў у галоўным корпусе і ў іншых навучальных карпусах. Неабходна звярнуць сур'ёзную ўвагу на арганізацыю харчавання супрацоўнікаў і выкладчыкаў, і тым самым праяўляць клопаты аб іх здароўі. Патрабуецца таксама як след наладзіць работу складскіх памяшканняў.

Калектыў універсітэта, партыйная, камсамольская і іншыя грамадскія арганізацыі ў новым навучальным годзе павінны вырашыць задачу далейшага ўдасканалення вучэбнага працэсу і ідэйна-выхаваўчай работы. Яны павінны прыкласці ўсё намаганні да таго, каб спецыялісты валодалі трывалымі ведамі, былі сапраўды знатакамі сваёй прафесіі, палітычна адукаванымі, ідэйна загартаванымі, адданымі справе Ленінскай партыі, сапраўднымі змагарамі за камунізм.

Калектыў мастацкай самадзейнасці універсітэта часта выязджае да сваіх шэфаў з канцэртамі.
На здымку вы бачыце, як радасна, гарачымі воплескамі сустракалі нашых самадзейных артыстаў.

ТЫ СОНЦУ І

Вось ужо сапраўды «ні ў казцы расказаць, ні пяром апісаць» тыя пачуцці, якія з'яўляюцца ў кожнага, калі здзяйсняюцца мары, імкненні. Здзейсніш іх, і адчуваеш сябе на «сёмым» небе, яго пакарыцелем.

Менавіта, аб паўнаце пачуццяў вось ўжо каторы дзень у 52 аудыторыі геолага-геаграфічнага факультэта гаворыць плакат: «Мы — геолагі, пакарыцелі «сёмага» неба!». А ў гістарычных хроніках БДУ з'явілася даведка: «31 жніўня 1966 года адбылося адкрыццё геалагічнага аддзялення пры геолага-геаграфічным факультэце. На першы курс прынята 50 чалавек».

— Геалагічная служба краіны патрабуе гэтага, — гавораць дэкан факультэта М. Т. Раманоўскі і прафесар А. С. Махнач. — Наша задача — выхаваць высокакваліфікаваных геолагаў.

Але вернемся да нашай незвычайнай першакурсніцы і пазнаёмімся з астатнімі першаадкрывальнікамі гэтага аддзялення.

— Ёй здорава пашанцавала, — гавораць у групе. Васіль Агафонаў растлумачыў, што яна ў чэрвені месяцы атрымала атэстат с залатой медаллю, а ў жніўні прачытала сваё прозвішча ў спісу залічаных ва універсітэт.

— Медалістаў у групе шмат. Васіль, ты таксама такі ж шчасліўчык, і Віця Траскун, і Валодзя Зубок.

Я слухаў іх, слухаў пакаленне сорак восьмага года

СТУДЭНЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ КІРАВАЦЬ ВУЧЫЦЬ

Выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў павінны ўмець кваліфікавана вырашаць задачы развіцця эканомікі, навуковай арганізацыі працы і кіравання вытворчасцю... Выпускнікі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў павінны валодаць навыкамі арганізацыі масава—палітычнай і выхаваўчай работы.

Аб гэтым гаворыцца ў Пастанове Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР, «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у краіне».

У гэтай Пастанове прад'яўляюцца вялікія запатрабаванні да выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў — будучых камандзіраў, будучых інжынераў вытворчасці, будучых настаўнікаў.

Сёння, чытаючы Пастанову, у думках звяраешся да мінулага вучэбнага года. Няўрымслівая камсамолія універсітэта зусім правільна вылучыла на сваю тэарэтычную канферэнцыю задачу выхавання не проста фізіка, хіміка, гісторыка, а фізіка-прапагандыста, фізіка-арганізатара, фізіка-чалавека. Гэта якраз тое, аб чым гаворыцца ў апошняй Пастанове Партыі і Урада. Цяпер можна смела зрабіць некаторыя вывады: «Эстафета слаўных спраў камсамолii БДУ» — гэта правільна ўзяты курс камсамольцамі нашага вну. Каб ісці сёння ў нагу з часам — мала быць проста хімікам, фізікам, гісторыкам. Трэба быць і добрым арганізатарам, эрудыраваным кіраўніком, які ведае эканамічныя законы грамадства, умее кіраваць людзьмі. Карацей, студэнт за сценамі вну сустрэнецца яшчэ з адной навукай — «навукай кіраваць».

Што ж гэта за навука? Давайце разгледзім яе на прыкладзе нашага універсітэта. Тры з паловай, амаль чатыры гады мысленне будучага выпускніка БДУ фарміруецца ў большасці на тэарэтычнай базе. І толькі паўгода ці год адводзіцца на вучэбную практыку. Такім чынам, чалавек, выходзячы са сцен вышэйшай школы, ведае, што рабіць. А вось як — ведае не кожны. Чаму? Ды таму, што ён не паспявае пазнаёміцца з навукай кіраваць.

У сценах вну ён пасягае тайны сваёй спецыяльнасці, а вось тайны практычнай арганізацыі спраў ён не засвойвае. На маладога інжынера, педагога, адразу навальваецца каля сотні вялікіх і малых спраў, устаюць перад ім сотні не вырашаных жыццёвых пытанняў, аб якіх на лекцыях і ў кнігах нічога не гаворыцца.

Каб лепш падрыхтаваць выпускніка для вытворчасці будуць створаны ў вну кафедры, кабінеты і лабараторыі па эканоміцы і арганізацыі вытворчасці. А вось як набыць навыкі арганізацыі масава-палітычнай і выхаваўчай работы з людзьмі, арганізаваць людзей, кіраваць імі, гаварыць з імі — гэта задача асабліва складаная. Адпаведнай кафедры і лалабараторыі не створыш. Гэтаму можа навучыць толькі калектыў. І ў першую чаргу — камсамол. Толькі ўдзел у практычнай дзейнасці арганізацыі можа даць магчымасць, набыць навыкі арганізатара грамадска - карысных спраў.

Вучыць будучага інжынера, педагога ўмела і эфектыўна карыстацца тэарэтычным багажом трэба пачынаць у сценах вышэйшай навучальнай установы.

Камсамол універсітэта робіць усё магчымае, каб прыцягнуць як мага больш моладзі да практычнага ўдзелу ў грамадскай дзейнасці арганізацыі. У вну працуе факультэт грамадскіх прафесій, шмат студэнцкіх навуковых гурткоў, спартыўных секцый, прафесіянальных калектываў мастацкай самадзейнасці, дзе студэнты не проста прымаюць удзел, а атрымліваюць практычныя навыкі самім арганізоўваць гурткі. Так, у нашай арганізацыі ёсць шмат самадзейных калектываў. Ва многіх гэта выклікае заспакоенасць: маўляў, наш калектыў дастаткова вялікі, там і без мяне справяцца...

А вось цяпер, калі арганізацыя дасягнула амаль сямі тысяч членаў камсамола, ніякія агульнауніверсітчыкія гурткі не змогуць ахапіць увесь гэты калектыў. А людзі ж ўсе павінны за пяць гадоў прайсці праз школу студэнцкай самадзейнасці.

Для гэтага трэба ствараць на курсах, факультэтах «клубы зацікаўленых», студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, драматычна-аматарскія калектывы, рухомыя агітацыйныя і канцэртныя брыгады для выязду ў падшэфныя школы, на прадпрыемствы, саўгасы і калгасы рэспублікі. Сёння гэта пад сілу кожнаму курсу любога факультэта нашага вну.

Трэба больш арганізоўваць кансультацыйных пунктаў у школах і рабочых інтэрнатах, стварацъ новыя і пашыраць межы ўжо дзейнічаючых школ (юных фізікаў, матэматыкаў, біёлагаў), арганізоўваць падрыхтоўчыя курсы на грамадскіх пачатках, праводзіць у гарадах і сёлах рэспублікі фізіка-матэматычныя алімпіяды, рыхтаваць няштатных прапагандыстаў, агітатараў, інструктараў камсамола і ствараць іх саветы.

Камітэтам камсамола факультэтаў неабходна узяць кожнага пад прыгляд свайго камсамольскага вока, каб студэнт быў заняты карыснай справай, акрамя вывучэння сваёй спецыяльнасці.

Будучы інжынер павінен умець рабіць эканамічны аналіз гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства. А для гэтага трэба мець практычныя навыкі, хутка арыентавацца ў вытворчых абставінах, самастойна раскрываць любыя сакрэты працы з людзмі.

Будучы педагог павінен яшчэ ў вну адчуць сваё месца ў калектыве грамадства.

Не сакрэт, што нават на старэйшых курсах гуманітарных факультэтаў не кожны студэнт можа правесці сход, прачытаць лекцыю, не гаворачы ўжо аб тым, што кожны з іх ужо павінен самастойна падрыхтаваць, арганізаваць і правесці якія-небудзь тэматычныя мерапрыемствы. І гэта таму, што часта на факультэтах, курсах усю грамадскую работу цягне адзін і той жа дзесятак «выбраных». Асноўная маса на працягу пяці гадоў выпускаецца з пад увагі, не прыцягваецца да грамадскай работы. Гэта вялікая перагрузка маральная і фізічная «выбраных». Няма нічога прасцей, як, скажам, у групе, на курсе размеркаваць абавязкі так, каб кожны камсамолец што-небудзь рабіў, быў чым-небудзь заняты. Тады ўжо мімаволі кожны будзе незаўважна атрымліваць пэўныя навыкі арганізатара грамадска-карысных спраў.

Усё, аб чым гаварылася вышэй, зводзіцца да таго, каб з першых дзён знаходжання у вну студэнт мог сябе прывучаць імкнуцца да грамадскай працы. Трэба спрабаваць свае сілы ва ўсіх галінах грамадскага жыцця. Акадэмічная «вучэбная» практыка — гэта ўсяго толькі адзін клас школы кіравання вытворчасцю і людзьмі. Астатнія класы студэнт можа і павінен прайсці ва універсітэце. І ў гэтым яму дапаможа камсамол. Ён паможа вырасці, правільна арыентавацца ў той ці іншай галіне грамадскага жыцця. Трэба толькі не заставацца ў баку ад камсамольскіх спраў, а прыносіць свой розум, сваю выдумку, свае рукі, свае схільнасці у агульны камсамольскі калектыў, калектыўную справу. І тады гэтая складаная навука кіраваць будзе дасягацца непрыкметна.

М. ЦІВА,
намеснік сакратара камітэта камсамола.

ВЕТРУ БРАТ...

нараджэння. На геалагічнае, гавораць, рамантыка прывяла.

З Леанідам Барэйшам, гэтым зграбным хлопцам, з сур'ёзнымі вачыма і цвердымі далонямі, я сустракаўся на нафтабудзе. Як Ламаносаў, пешшу прыйшоў ва універсітэт, падарожнічаючы з экспедыцыяй. Паступіў адразу, без усякага «вязення». Бачу, схільны толькі да сур'ёзнай размовы. Вы яго бачыце на здымку на першай лаўцы. Запытаў, ці цяжка вучыцца.

— Чым цяжэй, тым цікавей, — адказаў ён. — У нас тэма на выпускным, помню, была, ну ў самую сарцавіну: «Рамантыка нашых дзён у сучаснай савецкай літаратуры». Прыпомніў Твардоўскага: «Я народжаны на свет для жыцця— не для парадавога— артыкула». Па-мойму, жыць для жыцця, для справы — самае галоўнае і важнае! Іван Шалудзька, Валерый Пятровіч, Віктар Гусараў, Валерый Крыўчык згаджаюцца з ім.

Хлопцаў навучыла праца. Прыйшлі ва універсітэт, паспрабаваўшы хлеб геолага. Яны былі ў розных геалагічных экспедыцыях Валагодскай вобласці, мёрзлі ў палатках ля Курска, адчулі цяжкасці пераходаў праз Палескія балоты. Пазналі, што такое фізічная праца і кніга.

Рамантыкі? Вядома, але толькі вельмі сучасныя. Барвовыя ветразі і цяжкасці вялікіх пераходаў у час геалагічных экспедыцый для іх адно і тое ж. Чым цяжэй, тым цікавей.

І Леанід тады напісаў у экзаменацыйным сачыненні: «Студэнты. Ну, вядома, рамантыкі. Ісці да іх, на геалагічны».

Ну, а цяпер, прафесар, давай ім тэорыю, яны прыйшлі па яе ва універсітэт.

Ведаюць: стаць геолагам— трэба шмат ведаў. Вывучаюць агульна-адукацыйныя прадметы і дысцыпліны грамадска-гістарычнага плану і курс спецыяльных навук. І, вядома, вельмі многа крапатлівай работы ў лабараторыях. Ёй будзе ўдзяляцца штодзённая ўвага. Адчыніў дзверы лабараторыі і бачу, як схіліліся каля мікраскопаў, шматлікіх рознакаляровых кавалачкаў пароды Віктар Бабічаў і Вольга Кучына. У іх практычныя заняткі па крышталаграфіі. Побач прафесар Аляксандр Сямёнавіч Махнач. Першыя практычныя заняткі. А студэнты ўжо да іх праяўляюць такую ўвагу і запатрабаванні!

Набытыя цяпер ва універсітэце веды спатрэбяцца ў будучым, «каб руду адрозніць ад пароды пустой».

Алу Мазуркевіч, Таісу Ліхтаровіч і Наташу Сазонаву вабілі тры літары — БДУ, да якіх яны імкнуліся праз цяжкія формулы сінусаў і косінусаў, праз лагарыфмы і законы Н'ютона. Ужо добра ведаюць, што БДУ гучыць горда! Што універсітэт даў краіне дзесяткі акадэмікаў, сотні дактароў навук і ўжо незусім незлічоную колькасць старэйшых і малодшых навуковых супрацоўнікаў, і што выйсці з дыпломам з універсітэта ў сто разоў цяжэй, чым увайсці ў яго з атэстатам выдатніка.

Вось і закончыліся заняткі. Вясёлым гуртам выходзяць студэнты з аўдыторый, выходзяць з корпуса.

— Дзеці яшчэ, — пяшчотна вымаўляе жанчына ў гадах, вахцёр.

— Не, — гаворыць Мікалай Тарасавіч, — гэта ўжо не дзеці.

І маладое цяпер ужо не заўсёды зялёнае. І працягвае:

НА ЗДЫМКУ: (злева направа) Мікалай Аўхімовіч, Галя Шчэрба, Валодзя Рокшын ля «зямнога» шара.

— Наташа Сазонава, Таіса Ліхтаровіч, Галіна Шчарбак, Наташа Галілота спяшаюцца на рэпетыцыю ў танцавальны кружок мастацкай самадзейнасці. Георг Фурсікаў, Валерый Ропат, Мікалай Аўхімовіч — на спаборніцтвы па баскетболу. Іх прынялі ў зборную універсітэта. Валодзя Некрыш — паэт. Многія іграюць на музычных інструментах. Добра ведаюць і разумеюць музыку. Можна назваць прозвішча кожнага, а можна не называць, таму што яны вельмі розныя і ў той жа час падобныя адзін да аднаго.

Напярадзе ў іх сур'ёзныя будні і вясёлыя святы — цалінныя песні, цікавыя спрэчкі на дыспутах і жарты на КВНах, экзамены і збудаваныя імі дамы.

Свой рэпартаж заканчваю мажорна: вам вельмі пашчасціла, будучыя геолагі. Ні пуху вам, ні пяра!..

А. КАДЗЕТ.

УНІВЕРСІТЭТ—НЕ ТОЛЬКІ ДАРОГА ДА ДЫПЛОМА. ЯКІЯ ЯНЫ, ПРАЖСКІЯ СТУДЭНТЫ?

НАДЗЯ БАТУРЫЦКАЯ, АСПІРАНТКА БІЯЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА, АМАЛЬ ГОД ПРАВЯЛА Ў КАРЛАВЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ПРАГІ. СЁННЯ ЯНА ДЗЕЛІЦЦА ЎРАЖАННЯМІ АБ ЖЫЦЦІ, ВУЧОБЕ І ПОБЫЦЕ СТУДЭНТАЎ БРАТНЯЙ ЧЭХАСЛАВАКІІ.

Студэнты ўсюды падобныя на студэнтаў. Іх цяжка здыбаць з не студэнтамі. Але яны вельмі розныя, гэтыя шчаслівыя аптымісты.

Пражскія студэнты таксама, як і нашы, бегаюць на лекцыі, вельмі часта спазняюцца, так, як і нашы студэнты, нецярпялівыя ў чаканні святочнага дня— стыпендыі. І, вядома, ніколі не сумуюць. Яны могуць быць па-прафесарску рассеяннымі і задуменнымі, задзірыстымі і разважлівымі.

Самымі папулярнымі студэнцкімі словамі з'яўляюцца: стыпендыя, семестр, сесія. Студэнты Карлавага універсітэта гэтак жа часта вымаўляюць першыя два словы, за выключэннем апошняга — сесія. Справа ў тым, што сесія, як такая, ў іх адсутнічае. Няма такой сесійнай кампаніі, калі студэнты не ходзяць на заняткі, а толькі карпеюць днямі і начамі над падручнікамі і канспектамі, каб у пэўныя штурмавыя дні праверыць якасць «штурму».

Як жа здаюць экзамены пражскія студэнты? Па якіх прыметах яны пазнаюць, што сесія прыйшла? Перш за ўсё, на дошцы з'яўляецца аб'ява, што такі-та выкладчык гатоў праэкзаменаваць студэнтаў у такія-та тэрміны.

Студэнты выбіраюць найбольш зручныя для іх тэрміны. Сам працэс здачы экзамена—гэта гутарка выкладчыка са студэнтам без білетаў і, вядома, без шпаргалак, бо выкарыстаць іх няма ніякай магчымасці.

Студэнты Прагі любяць і умеюць думаць.

Гэтаму мастацтву вучаць іх на лекцыях, дзе яны не проста слухачы, а раўнапраўныя субяседнікі лектара. Зусім зеычайнай, напрыклад, з'яўляецца на лекцыі такая карціна. Студэнт нечага не зразумеў, тут жа спрабуе высветліць, не згаджаецца з лектарам, выбягае з-за стала, і спрэчка завязваецца ўжо каля дошкі. Зразумела, што такі студэнт да пятага курса пазнае больш, чым так званы «шэранькі» студэнт, а галоўнае—ён на абароне дыпломнай работы выкажа абавязкова сваю думку па пэўнаму пытанню і будзе яе абараняць, а не дакладваць.

Між іншым, гэта патрабуецца ад кожнага дыпламанта, таму так цікава заўсёды бывае на абаронах работ.

Свой універсітэт, які носіць імя Карла IV, студэнты вельмі любяць і шануюць і, зразумела, не толькі таму, што ён для іх «альма матэр», школа працы, мыслення і ведаў. Для іх Карлаў універсітэт—гэта яшчэ і месца лепшых святаў у жыцці кожнага студэнта. Адна са старэйшых вышэйшых навучальных устаноў Еўропы (заснаваны у 1348 годзе), Пражскі універсітэт мае багацейшыя традыцыі, аб значэнні якіх у выхаванні студэнтаў вялася гутарка на старонках газеты «Беларускі універсітэт». Я прысутнічала на адным вялікім студэнцкім свяце— уручэнні дыпломаў. Гэта свята, між іншым, мае маштабы гарадскога значэння. Рыхтуюцца ад яго ўсе: і студэнты, і выкладчыкі, і бацькі. Заказваюцца сукенкі чорнага або цёмна-блакітнага колеру; выпускнікі бегаюць у пошуках лепшага абутку, шукаюць лепшых майстроў-цырульнікаў, а бацькі ламаюць галовы над падарункамі і святочнымі сталамі. І вось гэтае свята прыходзіць. На кафедру з'яўляюцца выпускнікі. «Прыкасцюміліся» выкладчыкі, аспіранты. А 12 гадзіне пачынаецца цырымонія ўручэння дыпломаў выпускнікам факультэта прыродазнаўчых навук. Перад пачаткам святочнай працэдуры выпускніком не відаць: яны ў спецыяльным пакоі, што па суседству з гістарычнай залай Каралінум—месцам, куды ўсхваляваныя «героі» дня прыйдуць за атрыманнем дыпломаў.

На сцэне Каралінума сцягі краін, студэнты якіх навучаюцца ў Карлавым універсітэце, парты для выпускніком, трыбуна для выступаючых з прамовай. Аднекуль з вышыні даносяцца ўрачыстыя арганныя гукі студэнцкага гімну. Адчыняюцца дзверы, і пад гэтую музыку крочаць у напрамку да сцэны «прыматар» (звычайна гэта адзін з прарэктараў універсітэта), які нясе жазло універсітэта, дэкан факультэта прыродазнаўчых навук, выкладчыкі. Усе ў спецыяльным адзенні. За імі ідуць выпускнікі. Усе на месцах. Прарэктар дае наказ атрымоўваючым дыпломы. Дакладвае дэкан факультэта. Называюцца прозвішчы, і адзін за адным падыходзяць выпускнікі, бяруць кніжачкі, цалуюць жазло, прысягаючы захоўваць і шанаваць традыцыі універсітэта, дзе б яны ні працавалі. На трыбуне прадстаўнік выпускніком, які дзякуе ўсіх, хто дапамагаў ім прайсці цяжкай дарогай да дыплома, клянецца не абняславіць добрае імя універсітэта.

Гучыць гімн ЧСР. Яго змяняе урачыстая мелодыя марша, і працэсія ідзе ў адваротным кірунку. Выпускнікі трапляюць у абдымкі родных і блізкіх, сяброў, выкладчыкаў. Іх закідваюць кветкамі, фатаграфуюць. І доўга людзі не разыходзяцца. Свята працягваецца потым на кафедрах, у сем'ях дыпламантаў.

Я не буду апісваць іншыя слаўныя традыцыі Карлава універсітэта. Скажу толькі, што яны памнажаюцца і цяпер, забытыя аднаўляюцца, новыя нараджаюцца. Пражане добра ведаюць іх сілу, іх ролю ў выхаванні лепшых пачуццяў моладзі.

Не адстаюць і старэйшыя. Мяне ўсюды праследавала аб'ява: «Не забудзьцеся, што другога чэрвеня зусім недалёка». Што гэта за дата, мог адказаць вам не кожны студэнт, затое выкладчыкі добра ведалі і рыхтаваліся. Другое чэрвеня—гэта так званы «дэканскі» дзень. Яго святкуюць не толькі дэканы, не працуюць лабаранты, не прыходзяць на лекцыі прафесары.

Сёння ўсе накіроўваюцца да месца святкавання—лясной паляны. Тут усе работнікі універсітэта спрабуюць свае сілы ў валейболе, футболе, аматары —акварыумісты дэманструюць свае рыбкі, гумарысты эмагаюцца за «караля» смеху. А вось спаборніцтвы зусім незвычайныя. С цэнтра круга па радыусах спяшаюцца да сваіх гаспадароў вінаградныя слімакі. Гаспадары могуць дапамагчы сваім выхаванцам-слімакам перамагчы матэрыяльнай зацікаўленасцю — найбольш смачным ласункам удзельніка спаборніцтва.

Зусім прызвычаілася я ўжо да шматлікіх гасцей нашай пражскай кафедры мікрабіялогіі і генетыкі. Кожны, хто вучыўся і выхоўваўся тут, ніколі не праміне выпадку сустрэцца са сваімі выкладчыкамі, пасядзець у лабараторыі, з якой ён адпраўляўся ў Каралінум за дыпломам.

Днямі адбылося спаборніцтва лепшых баскетбалістаў першых курсаў. На ім вызначыліся кандыдаты ў зборную каманду універсітэта.

◆ Тры цудоўныя дні. ◆ СТУДЭНТЫ-ЖУРНАЛІСТЫ НА НЯСВІЖЧЫНЕ. ◆ Сувязь вучобы з практыкай. ◆ КАЛГАСНЫЯ ПАЛІ І ФЕРМЫ— БЫЛІ НАШЫМІ АЎДЫТОРЫЯМІ.

Студэнты чацвертага курса аддзялення журналістыкі, якія вучацца па чатырохгадовай праграме, дэтальна знаёмяцца з эканомікай і арганізацыяй сельскагаспадарчай вытворчасці. Нядаўна мы пад кіраўніцтвам выкладчыка кандыдата эканамічных навук М. М. Клімко правялі тры дні ў калгасе імя Калініна Нясвіжскага раёна.

Чаму іменна ў гэтым калгасе? Прывяду некаторыя лічбы і факты.

У 1951 годзе грашовы даход калгаса склаў 12 тысяч трыста рублёў. А ў 1965 — больш двух мільёнаў. Арцель мае 57 трактараў, 37 аўтамабіляў і мноства іншых сельскагаспадарчых машын.

Цікавыя і такія паказчыкі. Пятнаццаць год назад калгас меў усяго дванаццаць дойных кароў. Цяпер жа — 1200. Ураджайнасць зернявых з гектара складала тады шэсць цэнтнераў. А ў мінулым годзе сабралі па дваццаць аднаму.

Асаблівае захапленне выклікала ў нас будаўніцтва, якое вядзецца на цэнтральнай сядзібе — у мястэчку Сноў. Тут уступіў у строй цудоўны Дом культуры. Побач стаіць пяць двухпавярховых дамоў, у якіх жывуць калгаснікі, пераважна — маладажоны. Разам з пасведчаннем аб шлюбе яны атрымоўваюць ключы ад новых кватэр, у якіх маюцца ўсе камунальныя выгады: паравое ацяпленне, газ, гарачая і халодная вада, ванна, душ. Завяршаецца будаўніцтва трохпавярховага дома на дваццаць чатыры кватэры. Хутка вырасце своеасаблівы мікрараён. Карацей кажучы, мы сваімі вачыма ўбачылі, як расце дабрабыт сяла.

У вёсцы ёсць сталоўка, бытавыя прадпрыемствы, магазіны, гасцініца. Мы, напрыклад, жылі ў гасцініцы. Валодзю Какошка так спадабалася жыць у Снове, што ён нават спытаў у старшыні калгаса:

— Ці не думаеце вы арганізоўваць сваю шматтыражную газету? Можа вам журналіст спатрэбіцца?

Лічбы і факты, якія мы прывялі, красамоўна гавораць аб тым, чаму для правядзення практычных заняткаў па эканоміцы і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці быў выбраны, іменна калгас імя Калініна Нясвіжскага раёна.

На працягу трох дзён нашымі аўдыторыямі былі палі, фермы, сады. Як і ва універсітэце, вялі канспекты. Пісалі, прымасціўшыся дзенебудзь ля трактара або сеялкі, воза. Часам парту замяняла калена. Але ж нам, будучым журналістам, трэба ўмець пісаць у розных абставінах: і на ветры, і пад дажджом, і ў вагоне.

Многа цікавага ўбачылі і пачулі мы ў калгасе імя Калініна. З лекцыямі перад намі выступілі старшыня арцелі Я. В. Аляксанкін, сакратар партыйнай арганізацыі Ф. В. Панкратовіч. Аб сваёй рабоце расказвалі паляводы, жывёлаводы, садаводы. Усе «тэарэтычныя» палажэнні падмацоўваліся «практычна»: калгаснікі частавалі нас морквай, малаком, яблыкамі, ігрушамі.

Праграма нашай паездкі была складзена так, што мы змаглі пазнаёміцца з выдатнымі мясцінамі і гістарычнымі помнікамі нясвіжчыны. Прыемна было прайсціся па цудоўным парку, агледзець архітэктурныя збудаванні. Схіліўшы галовы, стаялі мы пад магутным таполем, пад якім у час Вялікай Айчыннай вайны нямецкія захопнікі расстралялі 1500 савецкіх грамадзян.

Відаць, я не памылюся, калі скажу, што ў кожнага з нас выклікала добрыя пачуцці знаёмства з такім цудоўным помнікам прыроды, як спарыш — дуб і сасна на дарозе з Нясвіжа ў Мінск.

І яшчэ аб адным помніку, які з'явіўся на нашай беларускай зямлі — аб помніку Ф. Э. Дзяржынскаму ў Стаўбцах. Гэта велічны помнік.

Не забылі мы завітаць у госці і да нашых калег — нясвіжскіх журналістаў, якія працуюць у рэдакцыі раённай газеты «Чырвоны сцяг». Яны расказалі нам аб сваёй рабоце, далі многа карысных парад.

На ўспамін аб паездцы ў нас застанецца многа добрых уражанняў. Адно самае прыемнае — аб людзях мястэчка Сноў, дзе мы жылі. Гэта працавітыя, прыветлівыя, добразычлівыя людзі. Сустрэлі яны нас ад шчырага сэрца. А на развітанне сакратар партыйнай арганізацыі Ф. В. Панкратовіч сказаў:

— Мы са старшынёй пазнаёміліся з членамі праўлення і вырашылі выдаць студэнтам-журналістам яблык, хто колькі хоча і якіх хоча. Ёсць сетка — бяры ў сетку. Ёсць мяшок — бяры ў мяшок...

Аб усім не раскажаш. А наогул гэта былі тры цудоўныя дні.

А. ЮДЧЫЦ.

МЯЧЫСЛАЎ ПЯТРОВІЧ СЕДНЯЎ

8 верасня трагічна загінуў выкладчык кафедры аналітычнай хіміі Мячыслаў Пятровіч Седняў.

Тав. М. П. Седняў нарадзіўся 12 красавіка 1921 года ў вёсцы Ламачына Аршанскага раёна, Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння хімфака Белдзяржуніверсітэта ў 1947 годзе працаваў загадчыкам біяхімічнай лабараторыі 2-й клінічнай бальніцы, выкладчыкам хіміі Мінскага электратэхнікума сувязі, малодшым навуковым супрацоўнікам, а затым старшым інжынерам-тэхнолагам Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі АН БССР. З 1965 года Мячыслаў Пятровіч — асістэнт кафедры аналітычнай хіміі універсітэта.

М. П. Седняў быў энтузіястам навукова-даследчай працы. Ён спалучаў у сваёй асобе хіміка, педагога і інжынера-даследчыка, маючы грунтоўныя веды ў галіне хімічнай тэхналогіі, электратэхнікі і радыётэхнікі.

Яму лёгка давалася канструктарства і вынаходства складаных прыбораў.

Мячыслаў Пятровіч закончыў эксперыментальную працу па тэме дысертацыі, апублікаваўшы па ёй сем работ.

Назаўсёды адыйшоў ад нас нястомны і выдатны педагог, сціплы чалавек, добры таварыш.

Памяць аб Мячыславе Пятровічу будзе жыць у нашых сэрцах.

ДЭКАНАТ, ПАРТБЮРО, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА І ПРАФБЮРО ХІМФАКА, КАЛЕКТЫЎ КАФЕДРЫ АНАЛІТЫЧНАЙ ХІМІІ

Рэдактар А. Лойка.

АТ 01071 Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1157.